Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
________________В. М. Міхееў
«____» _______________2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД-____/вуч.

# ГРЫМ

*Вучэбная праграма*
*па напрамках спецыяльнасцей*
*1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя),*
*1-18 01 01-03 Народная творчасць (тэатральная)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2013

**Складальнік**

*К. В. Мамацюк*, дацэнт кафедры тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**Рэцэнзенты:**

*У. А Мішчанчук*, дэкан тэатральнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, прафесар;

*П. А. Гуд*, загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, прафесар

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 30.08.2012 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 24.09.2012 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *К. В. Мамацюк*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна «Грым» з’яўляецца адной з прафілюючых у працэсе падрыхтоўкі рэжысёраў, арганізатараў тэатральнай творчасці, выкладчыкаў спецыяльных тэатральных дысцыплін. Яе выкладанне непарыўна звязана з засваеннем іншых спец-дысцыплін, такіх як «Рэжысура свят» і «Асновы рэжысуры», «Майстэрства акцёра».

Галоўнай *мэтай* навучання з’яўляецца знаёмства студэнтаў з мастацтвам сцэнічнага афармлення і змены знешнасці акцёра пры дапамозе грыміравальных фарбаў, пластычных налепак, наклеек у адпаведнасці з трактоўкай вобраза і рэжысёрскім вырашэннем спектакля. Таксама неабходна навучыць студэнтаў сучасным прыёмам грыміроўкі і прывіць добры мастацкі густ.

*Асноўныя задачы* дысцыпліны:

– пазнаёміць з гісторыяй развіцця грыміравальнага мастацтва і лепшымі дасягненнямі ў гэтай галіне выдатных майстроў беларускай і замежных сцэн;

– растлумачыць ролю і значэнне грыму ў стварэнні мастацкага вобраза ў цеснай сувязі з задумай рэжысёра і мастака спектакля;

– навучыць сучаснай тэхналогіі грыміроўкі, той паслядоўнасці, якой пры гэтым трэба прытрымлівацца;

– навучыць карыстацца грыміравальнымі фарбамі, налепкамі, наклейкамі, пастыжорскімі вырабамі, а таксама азнаёміць з санітарна-гігіенічнымі правіламі, якія неабходна выконваць пры грыміроўцы.

У выніку вывучэння дысцыпліны выпускнік павінен *ведаць:*

– гісторыю развіцця грыміравальнага мастацтва ад антычнасці да сучаснасці, а таксама методыку навучання майстэрству грыму ўдзельнікаў аматарскага тэатра;

*умець:*

– грыміраваць ярка, смела і дзёрзка па выразнасці і ў той жа час выкарыстоўваць мінімум грыміравальных сродкаў, адбіраць толькі самае неабходнае;

– самастойна вырашаць і выконваць грым для роляў у курсавых і дыпломных спектаклях.

Вывучэнне дысцыпліны «Грым» праходзіць па прынцыпе – ад простага да складанага. На лекцыйных занятках падаецца тэарэтычны матэрыял. Разам з паказам тэхналогіі грыміроўкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэарэтычны матэрыял выкладаецца і на практычных занятках. Затым студэнты самастойна выконваюць заданні па тэме, выкарыстоўваючы набытыя прыёмы грыміроўкі. На індывідуальных занятках студэнтам даюцца больш складаныя заданні. Студэнты вучацца грыміраваць на тварах сваіх аднакурснікаў, шукаюць грым для тых урыўкаў і курсавых спектакляў, у якіх удзельнічаюць як выканаўцы роляў пры праходжанні дысцыпліны «Майстэрства акцёра».

На самастойных занятках студэнты адпрацоўваюць атрыманыя веды, а таксама збіраюць іканаграфічны матэрыял па вывучаемай тэме.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны адводзіцца ўсяго 76 гадзін. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 4, практычныя – 56, індывідуальныя – 16 гадзін.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – залік і экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | практ | індывід |
| Уводзіны | 1 | 1 | | |
| **Раздзел I. Станаўленне мастацтва грыму** | | | | |
| *Тэма 1.* Кароткі агляд гісторыі грыму, яго тэхналагічнага працэсу | 2 | 2 | | |
| *Тэма 2.* Тэхнічныя сродкі грыміравання. Грыміравальныя матэрыялы і інструменты | 1 | 1 | | |
| **Раздзел II. Тэхніка грыму** | | | | |
| *Тэма 3.* Анатамічныя асновы грыму | 4 | | 4 | |
| *Тэма 4.* Узроставы грым | 8 | | 6 | 2 |
| *Тэма 5.* Карэкціровачны грым | 4 | | 2 | 2 |
| *Тэма 6.* Нацыянальны грым | 4 | | 2 | 2 |
| *Тэма 7.* Скульптурна-аб'ёмныя прыёмы грыміравання | 4 | | 2 | 2 |
| *Тэма 8.* Спецыяльны грым рэалістычны: казачныя персанажы | 4 | | 2 | 2 |
| *Тэма 9.* Спецыяльны грым умоўны: цыркавыя клоўны, грым тэатра «Кабукі» | 2 | | | 2 |
| *Тэма 10.* Спецыяльны грым: казачны грым жывёл і птушак | 8 | | 6 | 2 |
| *Тэма 11.* Партрэтны грым | 4 | | 2 | 2 |
| *Тэма 12.* Спецыяльны грым: шрамы, свежыя раны, сінякі | 4 | | 2 | 2 |
| **Раздзел III. Работа над вобразам** | | | | |
| *Тэма 13.* Эскіз узроставага характарнага грыму і ўвасабленне яго на партнёры | 4 | | 4 | |
| *Тэма 14.* Эскіз карэкціровачнага характарнага грыму і ўвасабленне яго на партнёры | 2 | | 2 | |
| *Тэма 15.* Эскіз нацыянальнага характарнага грыму і ўвасабленне яго на партнёры | 4 | | 4 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| *Тэма 16.* Эскіз умоўнага казачнага грыму і ўвасабленне яго на партнёры | 4 | | 4 | |
| *Тэма 17.* Эскіз рэалістычнага казачнага грыму і ўвасабленне яго на партнёры | 4 | | 4 | |
| *Тэма 18.* Выкананне характарнага грыму па літаратурным апісанні ці па рэпрадукцыях мастакоў | 4 | | 4 | |
| *Тэма 19.* Арганізацыя і методыка навучання майстэрству грыму ўдзельнікаў аматарскага тэатра | 2 | | 2 | |
| **Разам…** | **76** | **4** | **56** | **16** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Мэта і задачы дысцыпліны «Грым». Роля дысцыпліны ў падрыхтоўцы спецыялістаў. Значэнне грыму ў тэатры. Грым як кампанент спектакля, які садзейнічае данясенню да гледача мастацкай задумы драматурга, рэжысёра і акцёра. Грым як знешняе пераўвасабленне акцёра, заснаванае на ўнутраным пераўвасабленні, арганічнае яднанне і адзінства выразнай формы са зместам.

## Раздзел І. Станаўленне мастацтва грыму

### *Тэма 1. Кароткі агляд гісторыі грыму, яго тэхналагічнага працэсу*

Рэлігійныя абрадавыя святы чалавека, «магічная» расфарбоўка цел. Рытуальна-абрадавыя маскі ў Беларусі. Маскі малайскага і індыйскага тэатраў. Маскі старажытных тэатраў Грэцыі і Рыма. Умоўны, сімвалічны грым кітайскага тэатра і японскага тэатра «Кабукі». Грым і маскі сярэдневяковага містэрыяльнага тэатра. Паўмаскі і грым італьянскай камедыі дэль артэ.

Схаластычны, упрыгожваючы грым прыдворнага арыстакратычнага французскага тэатра. Акцёр Франсуа Тальма як адзін з заснавальнікаў рэалістычных тэндэнцый у грыме. Рэалістычны грым У. Самойлава, А. Ленскага, К. Станіслаўскага, Ф. Шаляпіна і М. Чаркасава. Зацвярджэнне МХАТ рэалістычнага грыму ў тэатры.

Гістарычны агляд развіцця і ўдасканальвання тэхнічных сродкаў і прыёмаў грыміроўкі. Маскі старажытнай Грэцыі, іх выраб і памеры. Сухія фарбы (разбаўленыя на вадзе з дабаўленнем расліннага масла) у кітайскім класічным і японскім тэатрах. Вынаходства і прымяненне тлустых грыміравальных фарбаў (на жывёльных тлушчах), звязаных са змяненнем сцэнічнага асвятлення. Далейшае ўдасканальванне тлушчавых грыміравальных фарбаў (на вазелінавай аснове).

Сучасныя грыміравальныя фарбы, выраблены на парфюмерным масле, цэрэзіне і пчаліным воску.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развіцце і ўдасканальванне наклеек ад жорсткіх (пап'е-машэ), паўжорсткіх (трыкатаж, замша, вата) да пластычнага грыму (губчатая гума).

*Тэма 2. Тэхнічныя сродкі грыміравання.*
*Грыміравальныя матэрыялы і інструменты*

Грыміравальныя фарбы (іх выраб і характарыстыка). Грым тэатральны дванаццаціколерны ў пластмасавай каробцы. Грым акцёрскі, грым канцэртны, вадкі грым (марылка), сухія і тлушчавыя румяны. Лак сандарачны для наклейкі пастыжорскіх вырабаў, лак для зубоў (чорны і белы), таніроўка для валасоў (сівізна). Бясшкоднасць грыміравальных фарбаў і грыміравальных прылад. Сучасныя патрабаванні да тэхналогіі грыміроўкі. Гігіена грыму і правілы разгрыміроўкі.

## Раздзел II. Тэхніка грыму

*Тэма 3. Анатамічныя асновы грыму*

Знаёмства з пабудовай чэрапа чалавека. Асноўныя косці чарапной каробкі: клінавідная, патылічная, цемянная, скроневыя і лобныя. Асноўныя косці чэрапа: скулавыя, косці носа, верхняя і ніжняя сківіцы. Асноўныя ўпадзіны чэрапа: лобная, дзве скроневыя, дзве падскулавыя, дзве падсківічныя, дзве вокавыя і насавая.

Асноўныя выпукласці чэрапа: два лобных бугры, дзве надброўныя дугі, дзве скулы са скулавымі дугамі, насавая косць, падбародачны бугор, два вуглы ніжняй сківіцы і зубы. Лінеарнасць і аб'ёмнасць у грыме. Лінія як сродак падкрэслівання меж касцей упадзін чэрапа. Паўцень як сродак аб'ёмнага стварэння выпуклых касцей і ўпадзін чэрапа. Блік як сродак аб'ёмнага падкрэслівання выпукласцей і стварэння фактуры косткі.

*Тэма 4. Узроставы грым*

Агульны тон. Роля колеру ва ўзроставым грыме. Тыпічныя прыкметы чалавека сталага ўзросту. Уплыў узросту, навакольнага асяроддзя, месца пражывання, стану здароўя на колер твару. Шэрыя, васкавыя колеры фарбаў для старэчага грыму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адцяняльныя фарбы. Рукі і шыя. Лінія і штрых. Прапрацоўка ўпадзін твару растушоўкай і пальцамі. Грыміроўка шыі і рук марылкай. Высвятленне выпукласцей, складак і маршчын.

Складкі і маршчыны. Узмацненне маршчын растушоўкай, фарбамі, калодыем. Носагубная маршчына. Маршчыны ілба, упадзіны і маршчыны вачэй, упадзіны падбародка. Асімітрычнасць маршчын у сталым узросце. Адбітак жыцця на твары чалавека. Налепкі з гумозу. Гумоз і яго выкарыстанне для налепак. Налепка з мэтай змянення формы носа. Нос падоўжаны, мясісты, з гарбінкай. Гумозныя налепкі падбародка і надброўных дуг. Штучная барада. Вялікая, шырокая барада. Востраканцавая і раздвоенная, сярэдняя і кароткая барада. Маленькія бародкі «экспаньёлкі». Колер барады. Сандарачны лак для наклейкі пастыжорскіх вырабаў. Сівізна. Вусы, бровы, бакенбарды. Пышныя, рэдкія, доўгія і кароткія вусы. Разнастайнасць чалавечых броваў: густыя і рэдкія, спакойныя і зламаныя, сумныя і энергічныя. Вялікія і малыя бакенбарды. Работа з крэпэ.

### *Тэма 5. Карэкціровачны грым*

Агульны тон. Каноны прыгажосці. Традыцыйная і сучасная падрыхтоўка твару да грыміравання. Падрыхтоўка агульнага тону для нанясення яго на твар з дапамогай губкі. Агульны тон для жаночага і мужчынскага твару.

Значэнне адцяняльных фарбаў. Зацямненне і высвятленне ўпадзін твару з дапамогай адцяняльных фарбаў па правіле: светлы тон прыбліжае, а цёмны – аддаляе. Нанясенне фарбаў з дапамогай пальцаў правай рукі (пальцы левай рукі – палітра). Лоб і шчокі. Разнастайнасць фактуры скуры твару. Нанясенне агульнага тону з дапамогай губкі і пальцаў. Нос і падбародак. Прамы класічны нос. Шырокая і вузкая спінкі носа. Жывапісныя прыёмы грыму для стварэння бачнасці розных відаў носа: кірпатага, зламанага, скрыўленага, скошанага з гарбінкай. Поўны і худы падбародак. Востры, тупы, валявы – выступаючы наперад, квадратны, падвоены, двайны падбародак. Ямачкі на падбародку. Класічныя, кароткія, доўгія, прамыя, зламаныя, увагнутыя, выгнутыя бровы. Валявыя і энергічныя бровы характэрныя для энергічнага чалавека. Для людзей мяккага характару тыпічны авальныя паўкруглыя бровы. Поўныя і вузкія губы. Адпаведнасць танальнасці рук і шыі, адкрытых частак цела агульнаму колеру твару. Спосаб нанясення вадкіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грыміравальных фарбаў (марылкі) для агульнага тону. Змяненне малюнка ўпалых вачэй. Падвядзенне вачэй, павелічэнне і памяншэнне іх. Міндалепадобнае, круглае вока. Падфарбоўка веек фарбамі грыму і тушшу. Выкарыстанне растушоўкі і пэндзлікаў. Запудрыванне і абнаўленне грыму. Выбар колеру пудры. Тампоны з ваты і марлі. Паслядоўнасць запудрывання. Абнаўленне грыму, агульнага тону, адценняў падводкі.

### *Тэма 6. Нацыянальны грым*

Агульны тон. Адцяняльныя фарбы пры грыміраванні мангалоіднай і негроіднай рас. Расавыя і нацыянальныя прыкметы. Асаблівасці формы галавы еўрапейца, японца, негра. Розніца іх знешнасці ў колеры і фактуры валасоў, скуры, формы вачэй, броваў, носа і скул. Нанясенне марылкі губкай. Канструктыўнае змяненне твару грыміравальнымі фарбамі. Падцяжка знешняга вугла вока для персанажа-японца. Шыфон, капрон і цюль. Заклейванне вокавай упадзіны. Разавыя вырабы з крэпэ і трэсу. Наклейванне вусоў, барод, броваў з крэпэ ў персанажах мангалоіднай і негроіднай рас.

### *Тэма 7. Скульптурна-аб'ёмныя прыёмы грыміравання*

Налепкі з гумозу розных форм носа: прамога, тонкага, шырокага, вострага, кірпатага, з гарбінкай, якія павінны мець натуральны і абавязкова плаўны пераход у форму сапраўднага носа. Наклейкі мікрапорыстай рызіны. Падцягванне носа і вачэй пры дапамозе газу і шыфону.

### *Тэма 8. Спецыяльны грым рэалістычны: казачныя персанажы*

Грым Кашчэя, Бабы-Ягі, Снежнай каралевы. Выкарыстанне гумозу, парыкоў, крэпэ, блішчынак, лаку для зубоў. Перавага адной асноўнай рысы характару: каварства Кашчэя, хітрасць Бабы-Ягі, фанабэрыстасць Снежнай каралевы. Гранічнае завастрэнне гэтых характэрных рыс казачнага вобраза ў грыме.

### *Тэма 9. Спецыяльны грым умоўны: цыркавыя клоўны, грым тэатра «Кабукі»*

Жывапісная размалёўка твару плямамі і лініямі. Лінейны і графічны характар умоўнага грыму. Прымяненне колеру ў чыстым выглядзе (без пераходаў і адценняў тону).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 10. Спецыяльны грым:*
*казачны грым жывёл і птушак*

Грым тыгра, сабакі, лісы, кошкі, ваўка, папугая і другіх казачных персанажаў.

*Тэма 11. Партрэтны грым*

Стварэнне партрэтнага грыму па мастацкіх рэпрадукцыях, фотаздымках і іншых іканаграфічных матэрыялах. Улік знешняга падабенства ствараемага персанажа і выканаўцы ролі. Адбор неабходных акцёрскіх сродкаў. Аб'яднанне знойдзеных разнастайных дэталяў у адзінае цэлае.

*Тэма 12. Спецыяльны грым: шрамы, свежыя раны, сінякі*

Выкарыстанне імітацыі крыві. Паталагічныя змяненні на твары. Сінякі і пабоі на целе. Нябрытасць. Выкарыстанне калодыю, сандарачнага лаку, чорнага лаку для зубоў, латэксу, жэлаціну, ваты і інш.

## Раздзел III. Работа над вобразам

*Тэма 13. Эскіз узроставага характарнага грыму*
*і ўвасабленне яго на партнёры*

Складанне славеснага партрэта сцэнічнага вобраза ў п'есах беларускай і замежнай класікі. Назіранне ў жыцці за тварамі пажылых людзей і падбор тыпічных характараў з мэтай увасаблення на партнёры.

*Тэма 14. Эскіз карэкціровачнага характарнага грыму*
*і ўвасабленне яго на партнёры*

Складанне славеснага партрэта героя ў сучасных п'есах. Акцэнт на індывідуальныя асаблівасці знешнасці выканаўцы ролі.

*Тэма 15. Эскіз нацыянальнага характарнага грыму*
*і ўвасабленне яго на партнёры*

Рысы твару выканаўцы і нацыянальныя асаблівасці тэатральнага персанажа. Адчуванне пачуцця меры і недапушчэнне перабольшання нацыянальных рыс і асаблівасцей у грыме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 16. Эскіз умоўнага казачнага грыму*
*і ўвасабленне яго на партнёры*

Распрацоўка клоўнскага грыму з ярка выяўленым характарам, улічваючы асаблівасці твару і індывідуальнасць партнёра. Варыянты размалёўкі твару яркімі плямамі і лініямі.

*Тэма 17. Эскіз рэалістычнага казачнага грыму*
*і ўвасабленне яго на партнёры*

Яркія і смелыя формы для адмоўных і фантастычных персанажаў, якія павінны кантраставаць з рэалістычным мяккім і абаяльным грымам станоўчых герояў. Максімум вынаходлівасці і творчай фантазіі ў характарных налепках з гумозу, аб'ёмных дэталях, парыках і галаўных уборах.

*Тэма 18. Выкананне характарнага грыму на партнёры*
*па літаратурным апісанні ці па рэпрадукцыях мастакоў*

Падбор мастацкіх рэпрадукцый (партрэтны жывапіс) або аўтарскіх рэмарак з выяўленнем персанажа адносна блізкага па сваім характары і пабудове да твару партнёра. Асаблівасці твару кожнага чалавека і непадабенства аднаго да другога. Арыентацыя ў грыме на самае галоўнае і самае прыкметнае. Адбор грыміравальных сродкаў для выканання грыму характарнага персанажа.

*Тэма 19. Арганізацыя і методыка навучання майстэрству*
*грыму ўдзельнікаў аматарскага тэатра*

Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне працэсу грыміравання. Выбар рабочага месца і грыміравальных фарбаў. Паслядоўнасць грыміроўкі. Методыка навучання – ад простага да складанага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Авдеев, А. Д.* Происхождение театра / А. Д. Авдеев. – М. ; Л. : Искусство, 1959. – С. 39 –256.

2. *Анджан, А.* Грим в кино / А. Анджан, Ю. Волчанецкий. – М. : Искусство, 1957. – 109 с.

3. *Когтев, Г. В.* Грим и сценический образ / Г. В. Когтев. – М. : Сов. Россия, 1981. – 111 с.

4. *Бейган, Ли.* Рим для театра, кино и телевидения / Л. Бейган. – М. : Искусство, 1997. – 172 с.

5. *Станиславский, К. С.* Собр. соч. : в 9 т. / предисл. О. Н. Ефремова, подготовка текста, статьи, вступление И. Н. Соловьевой ; отв. ред. О. Н. Ефремов ; МХАТ им. М.Горького, науч.-иссл. сектор школы-студии им. В. Н. Немировича-Данченко. – М. : Искусство, 1988. – Т. 1 : Моя жизнь в искусстве / под ред. И. Н. Соловьевой. – 622 с.

6. *Школьников, С. П.* Основы сценического грима / С. П. Школьников. – Минск : Выш. шк., 1976. – 208 с.

7. *Школьников, С. П.* Прически, головные уборы и украшения для сцены / С. П. Школьников. – Минск : Выш. шк., 1975. – 222 с.

*Дадатковая*

1. *Кихоу, В. Дж.-Р.* Техника работы профессионального художника-гримера / В.Дж.-Р. Кихоу. – М. : ГИТР, 2003. – 304 с.

2. *Вархолов, Ф. В.* Грим / Ф. В. Вархолов. – М. : Сов. Россия, 1964. –103 с.

3. *Кухаронак, Т. І.* Маскі каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 239 с.

4. *Логинова, В. А.* Заметки художника-гримера / В. А. Логинова. – М. : Искусство, 1978. – 88 с.

5. *Львов, Н. А.* О гриме / Н. А. Львов. – М. : Сов. Россия, 1964. – 110 с.

6. *Стромов, Ю. А.* Путь актера к творческому перевоплощению : пособие для театр. и культ.-просвет. учеб. заведений и коллективов худож. самодеятельности / Ю. А. Стромов. – М. : Просвещение, 1975. – 80 с. : ил.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*7. Сыромятникова, И. С.* История прически / И. С. Сыромятникова. – М. : Искусство, 1983. – 231 с.

*8. Сыромятникова, И. С.* Искусство грима и макияжа / И. С. Сыромятникова. – М. : РИПОЛ классик, 2005. – 272 с.

*9. Тэатральная* Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / пад агул. рэд. А. В. Сабалеўскага. – Мінск : БелЭн, 2002 – 2003. – Т.1. – С. 317–320.

*10. Черкасов, Н. К.* Литературное наследие. Черкасов и Эйзенштейн. Воспоминания о Черкасове / Н. К. Черкасов. – М. : ВТО, 1976. – 502 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ГРЫМ**

*Вучэбная праграма*
*па напрамках спецыяльнасцей*
*1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя),*
*1-18 01 01-03 Народная творчасць (тэатральная)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2013. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,87. Ул.-выд. арк. 0,45. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ